Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*Жлобаўцаў сяння і назовы няма. Мілы гэты, абжыты людзьмі і абагрэты каханнем кут зрабіўся пустэчаю. Нечыя неразумныя рукі вырвалі з карэннямі сад і мой лес, з якім разам мы падрасталі. Нехта высек і высокую старую альшыну над рэчкаю Ваўпянкай, яна цяпер стала не шчупаковай сялібай, а вузенькай стужачкай, якую нават каза перадзыгне. Па гэтай дарагой маяму сэрцу, сяння лысай зямлі блукаюць толькі вятры і мае ўспаміны.*

*Ларыса Геніюш*

Публікацыя і каментарый падрыхтаваны Я. М. Кісялёвай.

---

[1] ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 31. Воп. 1. Адз. зах. 392. Л. 1.

[2] Тамсама. Л. 4.

[3] Друкуецца паводле рукапісу Л. Геніюш. Гл.: ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 31. Воп. 1. Адз. зах. 190. Л. 1–18 адв.

*М. М. ЛІС*

## РУПЛІВЫ ДАСЛЕДЧЫК ЛІТАРАТУРНЫХ СКАРБАЎ: ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА ЮЛЬЯНА ПШЫРКОВА

У вялізнай кагорце выдатных беларускіх вучоных, дзеячаў культуры пачэснае месца займае руплівы даследчык беларускай літаратуры, літаратуразнавец, крытык, педагог, доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа Юльян Сяргеевіч Пшыркоў (1912–1980).

Ю. С. Пшыркоў нарадзіўся 31 кастрычніка 1912 года на Рагачоўшчыне, у прыгожай мясціне на правым беразе Дняпра, дзе яшчэ ў XVI ст. узнікла вёска Кісцяні.

Хлопец рос у тыповай беларускай сялянскай сям'і, дзе асновай жыццёвага ўкладу была праца. Пасля вяртання бацькі з франтоў Першай сусветнай вайны сям'я Пшырковых пачала жыць больш заможна: набылі кабылу, адбудавалі новую хату. Але за гаспадарчымі клопатамі не забываліся і на вучобу. Як успамінаў


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Ю. Пшыркоў, школа ў вёсцы існавала здаўна, і ўсе жыхары лічылі сваім абавязкам даць дзецям пэўную адукацыю, дый наогул у вёсцы амаль не было непісьменных[1].

У 1924 г., паспяхова вытрымаўшы выпускныя экзамены ў вясковай пачатковай школе, Юльян паступіў у пяты клас Свержанскай сямігодкі. У школе панавала вельмі спрыяльная атмасфера, як у плане выкладання прадметаў, так і ў адносінах паміж выкладчыкамі і выхаванцамі. Там жа выкладаў урокі гісторыі і малявання, праводзіў пазашкольныя заняткі па літаратуры будучы народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў. На жаль, праз год школа была зачынена. Далейшыя веды Ю. Пшыркоў набываў у Рагачоўскай сямігодцы. Паводле яго ўспамінаў, школа знаходзілася на месцы былой настаўніцкай семінарыі і пераняла ў спадчыну не толькі сам будынак, але і часткова педагагічны калектыў, сістэму навучання, добрыя традыцыі былой семінарыі. Пры школе дзейнічаў літаратурны гурток, членам якога разам з іншымі будучымі беларускімі літаратарамі, такімі як А. Жаўрук, А. Зарыцкі, быў і Юльян Пшыркоў. Гурткоўцы выдавалі свой рукапісны часопіс «Змаганне» і насценную газету.

Па заканчэнні школы ў 1928 г. шаснаццацігадовы, з добрымі адзнакамі юнак апынуўся на раздарожжы: куды пайсці вучыцца далей? Школьныя сябры ў пераважнай большасці скіроўвалі свой позірк ў бок Магілёўскага каморніцкага тэхнікума, бо прафесія каморніка – спецыяліста па землеўпарадкаванні – для жыхароў вёскі была вельмі прэстыжнай: з каморнікам лічыліся, яго паважалі. Туды ж сагітавалі паступаць і Юльяна. І хаця экзамены былі здадзены паспяхова, у лік студэнтаў гэтай навучальнай установы ён так і не трапіў – тады перавагу аддавалі дзецям беднякоў, рабочых, а бацька Юльяна Пшыркова лічыўся серадняком.

Відаць, так было наканавана лёсам – ісці нялёгкім і адказным, але і пачэсным шляхам педагога, навукоўца. І гэты шлях Ю. Пшыркоў з гонарам адолеў.

А тады, у 1929 годзе, таленавіты хлопец не без ахвоты паступіў на 2-гадовыя настаўніцкія курсы ў Рагачове. Настаўнікі ў той час былі вельмі запатрабаванымі, і таму ўжо праз год пасля навучання па скарочанай праграме ён атрымаў дакумен-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

тальнае пасведчанне на права выкладання ў пачатковых класах. На працягу чатырох гадоў працаваў у Буда-Кашалёўскім і Клічаўскім раёнах, спалучаў работу настаўніка з шырокай пазашкольнай арганізацыйнай і асветніцкай працай.

Навучаючы дзяцей, малады настаўнік і сам прагнуў новых ведаў, марыў пра далейшую адукацыю.

Юльян Пшыркоў завочна скончыў падрыхтоўчыя курсы пры Ленінградскім педінстытуце імя А. І. Герцэна і паспяхова здаў уступныя экзамены, адначасова вытрымаў іспыты і ў Ленінградскі гісторыка-філасофска-лінгвістычны інстытут (пазней ён быў рэарганізаваны ў філалагічны факультэт Ленінградскага універсітэта) і ў 1934 г. стаў, хаця і з цяжкасцямі (кіраўніцтва райана ні ў якім разе не жадала адпускаць таленавітага і перспектыўнага настаўніка), студэнтам гэтай вельмі прэстыжнай навучальнай установы.

Вучоба ва ўніверсітэце мела для Ю. Пшыркова выключна важнае значэнне. Менавіта тут з дапамогай сусветна вядомых вучоных-педагогаў быў закладзены трывалы падмурак для яго далейшай педагагічнай і навукова-даследчыцкай працы.

Спрыяльная ўніверсітэцкая атмасфера, добразычлівасць з боку выкладчыкаў і студэнтаў садзейнічала раскрыццю прыроднага таленту Ю. Пшыркова. Па ўспамінах яго былой аднакурсніцы, вядомага вучонага-літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук Л. М. Лотман, Юльян Пшыркоў быў вельмі актыўным, добрасумленным і творчым студэнтам, глыбока адданым навуцы[2]. Невыпадкова, што здольнасці, высокія чалавечыя якасці ў спалучэнні з вялікай любоўю да сваёй радзімы вылучалі яго сярод калег-студентаў.

Тэма дыпломнай работы Ю. Пшыркова з ініцыятывы загадчыка кафедры рускай літаратуры, літаратуразнаўца, крытыка, прафесара Г. А. Гукоўскага, была звязана з нацыянальнай літаратурай і прысвячалася творчасці класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа (1882–1956). Навуковым кіраўніком быў прызначаны малады на той час, але ўжо шырока вядомы ў навуковым асяроддзі літаратуразнавец, прафесар І. П. Яромін. Перад дыпломнікам адразу ж была пастаўлена адказная задача: напісаць



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

такую работу, якая мела б навуковую вартасць і якую без сумневу можна было б надрукаваць.

З удзячнасцю ўспамінаў Ю. Пшыркоў сваіх любімых выкладчыкаў прафесараў П. Беркава, Н. Піксанава, К. Пушкарэвіча, якія яго падтрымлівалі, давалі каштоўныя дакументы з уласных архіваў, а добрыя адносіны з П. Беркавым перараслі з цягам часу ў шчырае сяброўства і навуковае супрацоўніцтва. У лісце ад 5 кастрычніка 1968 г. да члена карэспандэнта АН СССР М. К. Піксанава Ю. Пшыркоў прызнаваўся: «Калі нам, многім былым Вашым студэнтам, суджана было зрабіцца вучонымі і нешта карыснае зрабіць для сваёй нацыянальнай культуры, то гэта, відаць, у значнай меры абгрунтавана тым, што нашымі настаўнікамі былі такія людзі навукі, як Вы, А. С. Арлоў, І. І. Талстой, І. П. Яромін, А. А. Смірноў, П. Н. Беркаў, М. К. Азадоўскі і інш. У нашых юначых душах Вы падпалілі агонь жадання йсці па цяжкім, але высакародным шляху служэння навуцы, Айчыне»[3].

Юльян Пшыркоў з усёй сур'ёзнасцю ўзяўся за дыпломную работу. Праца над тэмай была цікавай, але і адказнай. Да таго часу ён ужо няблага ведаў рускую і зарубежную літаратуру, цікавіўся літаратуразнаўчымі даследаваннямі, уважліва вывучаў творчасць беларускіх літаратараў. Працуючы над дыпломам, сутыкнуўся з пэўнымі пярэчаннямі свайму ўяўленню пра паэму Я. Коласа «Новая зямля» – крытыкі чамусьці не аддавалі належнага гэтаму найвыдатнейшаму твору. Са сваім бачаннем ідэі паэмы малады даследчык звярнуўся да самога Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча і атрымаў ад яго падтрымку. Пры гэтым Я. Колас заўважыў, што Ю. Пшыркоў – першы, хто правільна ацаніў «Новую зямлю» і пажадаў удачы будучаму даследчыку[4].

Неўзабаве дыпломная работа была з поспехам абаронена. Як пазней адзначалі крытыкі, Пшыркоў стаў адным з першаадкрывальнікаў сапраўднай ідэйнасці і мастацкай велічы і красы «Новай зямлі». Раздзел, прысвечаны «Новай зямлі», быў прыняты да друку ў часопіс «Полымя рэвалюцыі» і атрымаў станоўчы водгук тагачаснага галоўнага рэдактара М. Лынькова, а сакратар рэдакцыі Алесь Стаховіч нават прапанаваў маладому даследчы-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ку паспрабаваць свае сілы ў жанры рэцэнзіі – напісаць артыкул пра дакастрычніцкія паэмы Янкі Купалы.

Па заканчэнні ў 1939 г. Ленінградскага ўніверсітэта з адзнакай «выдатна»[5] Ю. Пшыркоў вярнуўся на радзіму, уладкаваўся ў Магілёўскі педінстытут, на працягу года здаў кандыдацкія экзамены. Там жа пазнаёміўся са студэнткай геафака Нонай Ягарэнка, якая ў хуткім часе стала яго жонкай. Але разам маладыя пражылі вельмі мала.

Увосень 1940 г. Юльян Пшыркоў быў прызваны ў армію. Яго вайсковая служба расцягнулася і на доўгія гады ваеннага ліхалецця. Ваяваў пад Ленінградам, Кёнігсбергам, быў тройчы паранены. Нона Іванаўна, застаўшыся на акупаванай гітлераўцамі тэрыторыі з толькі што народжанай дачушкай на руках, далучылася да падпольнага руху, была актыўнай яго ўдзельніцай, уваходзіла ў падпольную групу «Непакорныя».

У 1945 г. былы баец вярнуўся да мірнай працы. Я. Колас і М. Лынькоў, якія яшчэ ў студэнце Ю. Пшыркове разгледзелі будучага навукоўца, здольнага сказаць сваё слова ў беларускім літаратуразнаўстве, паспрыялі яго ўладкаванню на працу ў Інстытут літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук Беларусі.

З гэтага часу пачынаецца новая старонка ў творчай біяграфіі Юльяна Сяргеевіча Пшыркова. Працы ў інстытуце ён прысвяціў 35 гадоў, з іх больш як чвэрць стагоддзя, да дня раптоўнай смерці, кіраваў сектарам дакастрычніцкай літаратуры і тэксталогіі.

У навуку Ю. Пшыркоў прыйшоў з багатым жыццёвым вопытам, пэўнымі навуковымі напрацоўкамі і вялікім жаданнем зрабіць нешта карыснае для беларускага літаратуразнаўства.

Па сцвярджэнні А. Лойкі, Ю. Пшыркоў ніколі не шукаў лёгкіх шляхоў, абіраў найцяжэйшыя і ў многім быў першаадкрывальнікам[6].

Яго дзейнасць напачатку ў пераважнай большасці была звязана з вывучэннем творчасці Якуба Коласа. Пазней Ю. Пшыркоў стане адным з вядучых даследчыкаў жыцця і творчасці нашага вялікага песняра, адкрые новыя старонкі коласазнаўства, здолее ўзбагаціць яго сваімі грунтоўнымі, цікавымі даследаваннямі.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

У 1947 г. Ю. Пшыркоў паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную разгляду паэм Якуба Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка», а ў 1951 г. ўбачыла свет яго манаграфія «Якуб Колас: Жыццё і творчасць» – першае грунтоўнае даследаванне ў беларускім літаратуразнаўстве, прысвечанае класіку, якое, па словах крытыкаў, у значнай меры паклала «канец тым блытаным, ненавуковым поглядам на коласаўскую творчасць»[7]. Кніга была прыхільна сустрэта грамадствам.

І ў далейшым, нягледзячы на разнастайнасць творчых інтарэсаў, навуковых тэм, даследчык на працягу ўсяго свайго жыцця захавае адданасць коласазнаўству, прысвяціўшы вялікаму пісьменніку і чалавеку нямала каштоўных і цікавых навуковых прац, сярод якіх «Трылогія Якуба Коласа «На ростанях» (1956), «Эпас рэвалюцыі» (1975), выдадзеная пасмяротна кніга «Летапісец свайго народа» (1982) і іншыя даследаванні.

Вялікая заслуга належыць Ю. Пшыркову і ў глыбокім, аб'ектыўным і прынцыповым асэнсаванні працэсу станаўлення беларускай прозы 1920–1930-х гадоў. Яшчэ ў 1959 г. вучоным была падрыхтавана грунтоўная праца, прысвечаная гэтай тэме. Як сцвярджаў сам аўтар у пісьме ад 14 студзеня 1962 г. да вядомага літаратуразнаўца, доктара філалагічных навук А. М. Вазнясенскага, займацца гэтай праблемай ён стаў невыпадкова: «Мяне хвалявалі лёсы людзей, якія вельмі шмат зрабілі для развіцця нацыянальнай літаратуры і якія так бессаромна былі абылганы рознымі прайдзісветамі і нягоднікамі. Некалькі гадоў я ўпарта і настойліва збіраў і вывучаў факты, распытваў жывых сучаснікаў, параўноўваў факты і, нарэшце, зрабіў пэўныя высновы»[8].

Праца рыхтавалася як доктарская дысертацыя, але яе абарона была затрымана з-за сур'ёзных перашкод з боку нядобрасумленных людзей і адбылася толькі ў 1962 г., ужо пасля таго, як была надрукавана асобнай манаграфіяй. Да гонару Ю. Пшыркова трэба сказаць, што ён заставаўся вельмі прынцыповым у адстойванні сваіх поглядаў, навуковых пераканнняў. Яму было лягчэй адмовіцца ад аўтарытэтнага рэдактара кнігі, чым здрадзіць праўдзе[9]. Урэшце рэшт, і дысертацыя, і манаграфія (Беларуская савецкая проза. 20-я – пачатак 30-х гадоў. Мінск, 1960)



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

сталі здабыткамі шырокай навуковай і культурнай супольнасці, сустрэлі станоўчыя, пазітыўныя водгукі крытыкі, удзячнасць з боку тых літаратараў, чыя творчасць лічылася варожай і доўгі час замоўчвалася.

У багатым і разнастайным навуковым багажы Ю. Пшыркова нямала прац, прысвечаных творчасці выдатных беларускіх майстроў слова, сярод якіх Я. Купала, К. Крапіва, М. Лынькоў, М. Гарэцкі, У. Дубоўка і шмат іншых, а таксама даследаванняў, звязаных з імёнамі А. Пушкіна, В. Бялінскага, Т. Шаўчэнкі, І. Франко.

Працы Ю. Пшыркова, прысвечаныя творчасці таго ці іншага пісьменніка, заўсёды вылучаліся аб'ектыўным, глыбока прафесійным літаратуразнаўчым аналізам у спалучэнні з жывой манерай падачы матэрыяла. Адчувалася, што ў асобе Ю. Пшыркова арганічна ўжываюцца навуковец і літаратар. Невыпадкова яшчэ ў 1950 г. ён быў прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў.

Разнастайнасць навуковых інтарэсаў Ю. Пшыркова выклікала да жыцця і новыя тэмы даследаванняў. Вучонага цікавілі літаратурныя сувязі, узаемаўплывы. Пра гэта сведчаць такія яго работы, як «Уплыў творчасці А. С. Пушкіна на развіццё беларускай літаратуры» (1949), «Да пытання аб вывучэнні ўзаемасувязей у літаратуры» (1956) і інш.

Ю. Пшыркоў быў адным з аўтараў і рэдактарам саліднага навуковага выдання «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1977), за ўдзел у якім у канцы 1980 г. стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (пасмяротна).

Не менш асалоды прыносіла вучонаму і яго праца ў якасці тэкстолага. Пад яго ўважлівым кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле былі прааналізаваны і падрыхтаваны да друку літаратурныя тэксты XIX – пач. XX ст., складзены зборы твораў класікаў беларускай літаратуры Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, К. Чорнага і іншых пісьменнікаў.

Па словах літаратуразнаўца і крытыка С. А. Андраюка, «строгая навуковасць у адносінах да літаратурных з'яў і фактаў, высокі тэарэтычны ўзровень, здольнасць і уменне адкінуць любыя пабочныя меркаванні, не паддацца іх шкоднаму, часта далёкаму ад навукі і літаратуры ўплыву, патрыятызм і прынцыповасць



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

надаюць дзейнасці, працам Юльяна Сяргеевіча актуальнасць, навуковую і грамадскую значнасць»[10].

Самаадданая, плённая навуковая дзейнасць Ю. Пшыркова была высока адзначана ўрадам рэспублікі – у 1978 г. яму было нададзена званне заслужанага дзеяча навукі. Сярод іншых узнагарод вучонага – ордэны Вялікай Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалі.

Працу даследчыка Ю. Пшыркоў арганічна спалучаў з педагагічнай дзейнасцю: выкладаў у БДУ, Мінскім педінстытуце. Прафесар Ю. Пшыркоў з вялікай увагай ставіўся да таленавітай моладзі, рыхтаваў высокаадукаваных, рознабакова развітых навукоўцаў, настаўнікаў, літаратараў. Па словах літараратуразнаўца, пісьменніка, педагога, былога студэнта Ю. Пшыркова А. Лойкі, Юльян Сяргеевіч з поспехам перадаваў моладзі сваю прынцыповасць даследчыка, глыбокую павагу да фактаў, удумлівасць, чалавечасць і шчырасць[11]. «Яго лекцыі і семінары вылучаліся арыгінальнасцю думак, сваім адметным поглядам на рэчы, і, пэўна, асабліва знітоўвала нас з выкладчыкам яго манера рабіць нас як бы саўдзельнікамі сваіх развяг, уменне наблізіць студэнта да сябе, зацікавіць сваімі ведамі»[12]. Акрамя таго, Ю. Пшыркоў падтрымліваў цесную сувязь са школай, пісаў (у сааўтарстве) падручнікі і дапаможнікі па беларускай літаратуры для школьнікаў і студэнтаў ВНУ.

Юльян Сяргеевіч Пшыркоў, па ўспамінах яго сучаснікаў, быў аўтарытэтным вучоным, якому «ў высокай ступені былі ўласцівыя ўнутранае адчуванне патрэб часу, жывое пачуццё сучаснасці, якое грунтуецца на дакладным гістарычна-канкрэтным аналізе літаратурнага працэсу ў найцяснейшай суаднесенасці з жыццём народа, з лёсам краіны»[13], педагогам і непаўторным, абаяльным чалавекам. І чым бы ён не займаўся, ва ўсялякую справу ўносіў, акрамя свайго высокага інтэлекту, яшчэ і часцінку душы, а яна ў яго была вялікая і чулая.

У вучонага было шмат навуковых планаў, літаратурных задумак, але многае з таго ён так і не паспеў ажыццявіць – раптоўная смерць 23 снежня 1980 г. назаўсёды спыніла сэрца гэтага таленавітага навукоўца, сціплага і шчырага чалавека.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Пасля смерці Ю. С. Пшыркова яго вялізная архіўная спадчына была перададзена ў Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі), дзе зараз захоўваецца побач са шматлікімі асабістымі архівамі вядомых беларускіх дзеячаў навукі і культуры.

Фонд Ю. Пшыркова налічвае амаль паўтары тысячы адзінак захоўвання за 1861–1983 гг., у якіх утрымліваюцца надзвычай цікавыя матэрыялы, што адлюстроўваюць біяграфію вучонага, яго разнастайную творчую і службовую дзейнасць, уводзяць у свет захапленняў, прынамсі, знаёмяць з ёмістымі калекцыямі персаналій, аўтографаў, якую складаюць сабраныя фондаўтваральнікам з розных крыніц арыгінальныя творы пісьменнікаў, пісьмы і іншыя дакументы. Выклікае цікавасць эпісталярная спадчына, а таксама фатаграфіі, у тым ліку вучоных, пісьменнікаў, артыстаў. У цэлым асабісты архіў Ю. С. Пшыркова па напоўненасці разнастайнымі матэрыяламі, шырокім храналагічным ахопе, безумоўна, уяўляе каштоўную крыніцу для даследчыкаў культуры, літаратуразнаўцаў, гісторыкаў, дапамагае прасачыць станаўленне Ю. С. Пшыркова як вучонага і як асобы.

---

[1] Пшыркоў Ю. С. З майго жыццёпісу // Пра час і пра сябе : аўтабіяграфіі беларус. пісьменнікаў. Мінск, 1966. С. 303.

[2] Лотман Л. М. В кругу студентов и коллег // Воспоминания о Павле Наумовиче Беркове, 1896–1969 : из истории рос. науки. М., 2005. С. 57, 58.

[3] ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 30. Воп. 1. Адз. зах. 890. Л. 1.

[4] Пшыркоў Ю. С. Адзнач. твор. С. 307.

[5] ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 30. Воп. 1. Адз. зах. 1270. Л. 3.

[6] Тамсама. Адз. зах. 1292. Л. 2.

[7] Тамсама. Адз. зах. 1280. Л. 1.

[8] Тамсама. Адз. зах. 865. Л. 2.

[9] Тамсама. Л. 2 адв.

[10] Андраюк С. Творчы неспакой даследчыка // Звязда. 1972. 31 кастр. № 256 (16067). С. 4.

[11] ЦНБ НАН Беларусі, АРКіР. Ф. 30. Воп. 1. Адз. зах. 1292. Л. 2.

[12] Лойка А. Кувайце, кісцянёўскія зязюлі!.. : да 60-годдзя Ю. С. Пшыркова // Полымя. 1972. № 10. С. 189.

[13] Андраюк С. Зробленае – нам пакінутае // Літаратура і мастацтва. 2012. 26 кастр. С. 4.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by